15. Очерки истории профсоюзов Белоруссии (1905–1969 гг.). – Минск: Беларусь, 1970. – 474 с.
16. Майзель, Л.Н. 1905–1907 гг. на Беларусі. Хроніка падзей / Л.Н. Майзель. – Мінск, 1934. – 533 с.
17. Міцкевіч, К. Да гісторыі Саюза працаўнікоў асветы на Беларусі / К. Міцкевіч // Асвета, 1924. – № 2. – С. 21–22.
18. Национальный исторический архив Беларуси. Ф. 2649. – Оп. 1. – Д. 146. Дело о количестве закрытых профессиональных обществ в Витебской губернии, 1908–1909 гг.
19. Сяменчык, М.Я. Да пытання аб дзейнасці прафесійных саюзаў пасля Лютаўскай рэвалюцыі (сакавік–кастрычнік 1917 г.) / М.Я. Сяменчык // Профсоюзы в социально ориентированной рыночной экономике. – Минск, 2004. – С. 54–55.

## Нацыянальны склад прафсаюзаў БССР і іх беларусізацыя ў перыяд НЭПа

Дубовік А. А. г. Мінск, БНТУ

Важным этапам станаўлення айчыннага прафсаюзнага руху сталі 1920-я гг., калі ён арганізацыйна аформіўся – у пачатку 1921 г. быў створаны Савет прафсаюзаў Беларусі. Дзейнасць прафсаюзаў у перыяд новай эканамічнай палітыкі знайшла пэўнае адлюстраванне ў агульных працах па гісторыі прафсаюзаў Беларусі, але пакуль не стала прадметам спецыяльнага манаграфічнага даследавання. Мэта дадзенага артыкула – раскрыць нацыянальны склад і паказаць працэсы беларусізацыі ў прафсаюзах БССР у перыяд нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва 1920-х гг.

Мэтанакіраваны пачатак ажыццяўленню НЭПа паклаў X з’езд РКП (б), які адбыўся ў сакавіку 1921 г. і прыняў пастанову аб замене харчразвёрсткі натуральным харчпадаткам. Летам 1921 г. (па стану на 1 жніўня) прафсаюзы БССР, якая ў той час складалася толькі з шасці паветаў Мінскай губерні, налічвалі 58 160 членаў і аб’ядноўвалі 98,8 % рабочых і служачых 5659 прадпрыемстваў і ўстаноў. Дзейнічаў 21 галіновы саюз [1, с. 151]. Па стану на канец кастрычніка 1921 г., беларусы складалі 48,9 %, яўрэі – 36 %, рускія – 8,9 %, палякі – 4,6 %, іншыя нацыянальнасці – 1,6 % членаў прафсаюзаў. Але калі ў саюзе працаўнікоў зямлі і лесу ўдзельная

вага беларусаў дасягала 93 %, у саюзе працаўнікоў народнай сувязі – 88,5 %, дык у саюзе швейнай прамысловасці – толькі 1 %, паліграфічнай вытворчасці – 8,9 %, саюзе гарбароў – каля 10 %. У апошніх саюзах абсалютную большасць складалі рабочыя яўрэйскай нацыянальнасці – адпаведна 97,9 %, 83,2 % і 74,2 %. Яны таксама пераважалі сярод членаў саюзаў харчасмакавай прамысловасці, транспартных рабочых, народнага харчавання, металістаў, савецкіх работнікаў. Адносна высокі працэнт рускіх быў сярод рабочых-металістаў (18,7 %) і транспартных рабочых (18 %). Рабочыя польскай нацыянальнасці найбольш шырока былі прадстаўлены ў саюзе хімікаў – 47,9 % [2, арк. 13].

Нацыянальны склад кіруючых прафсаюзных органаў у цэлым адпавядаў складу галіновых саюзаў. З 69 членаў пленума Саўпрафбела, абранага на II Усебеларускім з'ездзе прафсаюзаў (красавік 1922 г.), 38 чалавек (55 %) былі яўрэйскай нацыянальнасці, 21 (30,4 %) – беларусы, 8 чал. (11,5 %) – рускія [3, арк. 4].

У ліпені 1924 г. на II сесіі ЦВК БССР і пленуме ЦК КП(б)Б была абвешчана беларусізацыя як агульнарэспубліканская дзяржаўная палітыка. Яна не магла не закрануць прафесійныя саюзы – масавыя арганізацыі рабочага класа. V Усебеларускі з'езд прафсаюзаў (лістапад 1925 г.) канстатаваў недаацэнку нацыянальнага пытання з боку многіх прафарганізацый, іх нерашучасць у правядзенні мерапрыемстваў па абслугоўванні працоўных мас на іх роднай мове [4, с. 18]. Дырэктывы V з'езда і пленумаў Цэнтральнага савета прафесійных саюзаў Беларусі (ЦСПСБ) аб укараненні нацыянальных момантаў у культпрацу, аб вядзенні масавай работы на роднай мове леглі ў аснову практычнай дзейнасці прафсаюзных органаў. Ніводная інструкцыя не абыходзілася без упаміну аб неабходнасці шырэй адлюстроўваць нацыянальныя асаблівасці. Але на гэтым кірунку было шмат перашкод, на пераадоленне якіх патрабаваўся час. Многія рабочыя (беларусы, яўрэі) лічылі ліквідацыю непісьменнасці на роднай мове пустой справай, дакладчыкаў на сходах прасілі выступаць на рускай мове [5, с. 111].

У 1927 г. Прэзідыум ЦСПСБ двойчы (у лютым і кастрычніку) абгаворваў пытанне аб нацыянальнай рабоце і беларусізацыі ў прафсаюзных органах, прычым другі раз пытанне разглядалася пасля праведзенага абследавання нацыянальнай справы

ў прафарганізацыях [6, арк. 10–11]. К восені 1927 г. у гэтай рабоце меліся некаторыя дасягненні. Першымі перавялі сваё справаводства на беларускую мову саюз сельскагаспадарчых і лясных рабочых (СГЛР) і саюз працаўнікоў асветы. Іх прыклад перанялі саюзы будаўнікоў, дрэваапрацоўшчыкаў, работнікаў сувязі, медсанпрацы, саўгандальслужачых. Але масавая работа большай часткі цэнтральных праўленняў саюзаў працягвала весціся на рускай мове, тады як у раёнах многія нізавыя ячэйкі амаль ўсю працу праводзілі на беларускай мове (за выключэннем Гомельскай і Рэчыцкай акруг, якія ўвайшлі ў склад БССР толькі ў канцы 1926 г.). У той жа час саюзы швейнікаў і гарбароў абслугоўвалі сваю членскую масу ў асноўным на яўрэйскай мове, таму што адпаведна 92,1 % і 71,9 % іх членаў складалі рабочыя яўрэйскай нацыянальнасці [7, арк. 14]. У цэлым прафсаюзы Беларусі аб’ядноўвалі ў 1927 г. 218,8 тыс. чалавек. Беларусы складалі 52,1 %, яўрэі – 25,2 %, рускія – 9,7 %, палякі – каля 3 %. У саюзах прамысловай групы ўдзельная вага беларусаў была трохі меншай – 41,1 %, амаль такая ж, як і яўрэяў (40,7 %). У той жа час у саюзе СГЛР доля беларусаў была найбольш высокай – 77,1 % [7, арк. 14; 8, арк. 2].

Аднак у галіне ўкаранення нацыянальных момантаў у дзейнасць прафсаюзаў многае заставалася невыкананым. Напрыклад, саюз чыгуначнікаў не ажыццявіў дырэктывы вышэйшых праворганаў і рашэнні ўсебеларускай галіновай нарады па беларусізацыі. Амаль усё яго справаводства вялося на рускай мове. Саюз хімікаў, асноўную частку членаў якога складалі беларусы, работу праводзіў толькі на рускай мове, у платным апараце цэнтральнага праўлення саюза з чатырох супрацоўнікаў не было ніводнага беларуса [5, с. 24]. Прэзідыум ЦСПСБ у сваёй пастанове ў кастрычніку 1927 г. засяродзіў увагу саюзных арганізацый на маючых месца недахопах і прыняў шэраг канкрэтных прапаноў па ўдасканальванні нацыянальнай працы. Прапанавалася прапусціць прафактыў праз гурткі і школы па вывучэнні беларускай мовы, асвятляць пытанні нацыянальнай палітыкі ў дакладах, на вечарах пытанняў і адказаў, больш шырока ўводзіць беларускую мову ў культурна-масавую работу ў клубах і чырвоных кутках, папаўняць бібліятэкі беларускай літаратурай [6, арк. 10–11].

VI Усебеларускі з’езд прафсаюзаў (лістапад 1927 г.), адзначыўшы асобныя поспехі ў галіне нацыянальнай работы

саюзных арганізацый, таксама палічыў праведзеную працу недастатковай. З'езд ухваліў пастанову Прэзідыума ЦСПСБ аб становішчы нацыянальнай працы ў праворганах і прапанаваў усім саюзам распрацаваць практычныя мерапрыемствы, накіраваныя на яе ажыццяўленне. Адзначалася неабходнасць у большай ступені папулярызаваць сярод шырокіх пластоў членаў прафсаюзаў значэнне нацыянальнай палітыкі і беларусізацыі, а таксама прыняцця мер па поўным прыцягненні кіруючых кадраў і нізавога прафактыву да вывучэння беларускай мовы [9, арк. 186–187].

У 1928–1929 гг. на пленумах і пасяджэннях Прэзідыума ЦСПСБ неаднойчы ставілася пытанне аб нацыянальнай рабоце ў галіновых саюзах, заслухоўваліся даклады цэнтральных праўленняў аб выкананні дырэктыў па нацыянальным пытанні. За нездавальняючую працу ў гэтым накірунку ў 1928 г. была вынесена вымова старшыні цэнтральнага праўлення (ЦП) саюза саўгандальслужачых і пастаўлена на від кіраўніцтву саюза папернікаў [6, арк. 10–11]. У 1929 г. ЦСПСБ зняў з пасады старшыню ЦП саюза мясцовага транспарту за нежаданне пераводзіць працу прафсаюзнага апарата на беларускую мову, а таксама вынес вымову старшыні ЦП саюза гарбароў за марудныя тэмпы беларусізацыі [10, арк. 42–43].

На II пленуме ЦСПСБ у студзені 1928 г. па дакладу рэдакцыйна-выдавецкага аддзела ЦСПСБ была прынята пастанова, што яго галоўнай задачай з'яўляецца далейшае выданне і распаўсюджванне прафсаюзнай літаратуры на нацыянальных мовах, у асаблівасці на беларускай, і намечаны канкрэтныя мерапрыемствы па ажыццяўленні гэтай задачы [6]. Дарэчы, часопіс «Прафесіянальны рух Беларусі», які выдаваўся ў 1925–1929 гг. (усяго выйшла 100 нумароў), змяшчаў артыкулы не толькі на беларускай альбо рускай мовах, асобныя матэрыялы друкаваліся на яўрэйскай ці польскай мове. Паступова павялічвалася колькасць шматтыражак і насценгазет на беларускай мове.

Стан беларусізацыі прафсаюзнага апарата ў канцы 1920-х гг. характарызаваўся наступнымі лічбамі: у 1930 г. з адказных работнікаў ЦСПСБ ведалі і карысталіся беларускай мовай 13 чалавек, ведалі, але не карысталіся – 8 і зусім не ведалі – 4 чалавекі. З сямі старшынь акруговых міжсаюзных прафбюро і дваццаці старшынь цэнтральных праўленняў галіновых саюзаў

добра ведалі беларускую мову 6 чалавек, здавальняюча – 12, дрэнна – 8 і адзін зусім не ведаў [7, с. 27; 10, арк. 42–43]. Для вывучэння беларускай мовы ў 1928–1929 гг. быў арганізаваны шэраг гурткоў і курсаў на прадпрыемствах і ўстановах. У сетцы прафсаюзнай асветы вывучаліся гісторыя і эканоміка Беларусі, беларуская літаратура. Аднак пачын прафсаюзнай арганізацыі мінскага завода імя Варашылава ў гэтым накірунку не быў падхоплены на большасці іншых прадпрыемствах, і колькасць гурткоў па авалодванні беларускай мовай была недастатковай [11, с. 118].

Фарсіраваць працэс увядзення роднай мовы было б шкодна, і прафсаюзам прыходзілася быць у гэтай справе асцярожнымі. Укараненне нацыянальных момантаў у практыку прафсаюзнай работы ішло па лініі прыстасавання саюзных апаратаў да абслугоўвання асобных нацыянальных груп на іх роднай мове; ажыццяўлення ўсіх відаў масавай работы на мовах, зразумелых для ўсіх нацыянальных груп членаў саюза; прывядзення складу выбарных прафсаюзных органаў у прапарцыянальныя суадносіны з нацыянальным складам абслугоўваемых імі членаў з дастатковым прадстаўніцтвам усіх нацыянальных груп; шырэйшай папулярызацыі і растлумачэння членам прафсаюзаў асноўных прынцыпаў нацыянальнай палітыкі савецкай улады і значэння беларусізацыі.

Аднак палітыка беларусізацыі не зводзілася толькі да распаўсюджвання беларускай мовы. Немалое значэнне надавалася працы з нацыянальнымі меншасцямі. Для пашырэння іх абслугоўвання прафсаюзы арганізавалі спецыяльныя сектары нацыянальнай работы і інтэрнацыянальнага выхавання пры палітыка-культурных саветах клубаў і ФЗМК, правялі ўсебеларускую нараду па рабоце сярод нацменшасцей, прымалі актыўны ўдзел у дзейнасці Нацыянальнай камісіі ЦВК. Прадстаўнікі нацыянальных меншасцей адыгрывалі істотную ролю ў грамадска-палітычным і гаспадарчым жыцці БССР. Беларусізацыя з'яўлялася важным сродкам барацьбы як з вялікадзяржаўным шавінізмам, так і з праяўленнямі нацыяналізму з боку асобных груп. Разам з тым у гэты час на некаторых прадпрыемствах мелі месца праявы антысемітызму, а, з другога боку, яўрэйскага і польскага нацыяналізму. Таму на пасяджэнні Прэзідыума ЦСПСБ 24 снежня

1929 г. было абмеркавана пытанне “Аб інтэрнацыянальным выхаванні рабочых” [12, л. 496]. Але абсалютная большасць прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей прыхільна ставілася да беларусізацыі.

Адным з цэнтральных кірункаў беларусізацыі ў прафсаюзах з’яўлялася карэнізацыя – выхаванне і вылучэнне кадраў з карэннага насельніцтва на прафсаюзную работу. Пры распрацоўцы нацыянальнай палітыкі ставілася задача вылучэння прадстаўнікоў карэннага насельніцтва на тую ці іншую пасаду не толькі па нацыянальных, але і па дзелавых якасцях, веданні беларускай і рускай моў, гісторыі Беларусі і г. д. Летам 1927 г. беларусы складалі 47 % членаў Прэзідыума ЦСПСБ і 38 % членаў прэзідыумаў акруговых саветаў прафсаюзаў. Аднак у платным апараце ЦСПСБ і асабліва акруговых прафсаветаў і ў 1927 г. пераважалі работнікі яўрэйскай нацыянальнасці – адпаведна 43 % і 55,5 % супраць 28,6 % і 33,4 % беларусаў [5, с. 25–26]. У 1931 г. удзельная вага беларусаў дасягнула ўжо сярод членаў ЦСПСБ 50,8 %, членаў ЦП саюзаў – 50,4 %, членаў райпрафсаветаў – 63 % і членаў ФЗМК – 66,2 % [11, с. 117]. У цэлым жа платны апарат прафсаюзных органаў, маючы ў сваім складзе разнастайныя нацыянальныя групы, быў прыстасаваны да абслугоўвання сяброў (членаў) прафсаюзаў.

Трэба адзначыць, што першым старшынёй вышэйшага выбарнага прафсаюзнага органа рэспублікі ў 1921–1924 гг. быў Ш.Ш. Ходаш – мінскі рабочы-сталяр, які шмат зрабіў для станаўлення прафруху на Беларусі. Потым ЦСПСБ узначальвалі рускі М.Я. Ендакоў (снежань 1924 г.–студзень 1927 г.), украінец І.М. Перапечка (студзень 1927 г.–чэрвень 1928 г.), рускі І.П. Рыжоў (чэрвень 1928 г.–май 1932 г.).

Буйнымі прафсаюзнымі работнікамі сталі ў перыяд НЭПа беларусы В.Ф. Шаранговіч, які ў 1924 – пачатку 1926 г. з’яўляўся адказным сакратаром ЦСПСБ, а пазней, пасля прафсаюзнай і партыйнай работы ў РСФСР, быў у сакавіку 1930 г. абраны другім сакратаром ЦК КП(б)Б; А.А. Турлай, які ў 1922–1925 гг. быў загадчыкам аддзела тарыфна-эканамічнай работы, а ў 1926–1927 гг. – адказным сакратаром ЦСПСБ; М.П. Гнілякевіч – старшыня ЦП буйнейшага саюза СГЛР, адначасова ў 1926 г. адказны сакратар ЦСПСБ, з мая 1929 г. наркам працы БССР;

А.М. Платун – старшыня ЦП саюза працаўнікоў асветы, з 1929 г. наркам асветы БССР; М.І. Кулак (Аверын) – з лістапада 1927 г. загадчык культаддзела, з сакавіка 1929 г. адказны сакратар ЦСПСБ; М.М. Клімковіч – з 1929 г. загадчык культаддзела ЦСПСБ, пазней старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў БССР і іншыя.

Па меры ажыццяўлення палітыкі індустрыялізацыі колькасна раслі прафсаюзныя рады, мяняўся іх нацыянальны склад. У сувязі з ростам ўдзельнай вагі беларусаў сярод членаў прафсаюзаў павялічылася іх доля ў складзе ФЗМК: з 56,3 % у пачатку 1927 г. да 66,2 % у канцы 1931 г. [7, арк. 294; 11, с. 117].

Але ў канцы 1920-х гг. беларусізацыя пачала згортвацца. Прыхільнасць да беларускай мовы і культуры, што раней лічылася за гонар, стала важкім аргументам для абвінавачвання ў нацыянал-дэмакратызме.

У цэлым жа ажыццяўленне ў перыяд НЭПа палітыкі беларусізацыі адначасова з сацыяльна-эканамічным і культурным абслугоўваннем нацыянальных меншасцей садзейнічала гарманізацыі міжнацыянальных адносін у рэспубліцы, паляпшэнню работы дзяржаўных і грамадскіх органаў кіравання, у т. л. прафсаюзаў.

**Выкарыстаная літаратура**

1. Советская Белоруссия. – Минск: Гос. изд-во ССРБ, 1921. – 307 с.

2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 265. – Воп. 1. – Спр. 666. Сведения Мингуботделов профсоюзов ... о национальном составе членов профсоюзов, 1921 г.

3. НАРБ. – Ф. 265. – Воп. 1. – Спр. 1000. Сведения Мингуботделов профсоюзов о численности и национальном составе членов профсоюзов, 1922 г.

4. Резолюции 5-го Всебелорусского съезда профсоюзов. – Минск, 1924. – 80 с.

5. Отчёт Центрального совета профсоюзов Белоруссии за период декабрь 1925 г. – июнь 1927 г. К VI Всебелорусскому съезду профсоюзов. – Минск, 1927. – 117 с.

6. НАРБ. – Ф. 265. – Воп. 1. – Спр. 2582. Матэрыялы аб правядзенні беларусізацыі сярод членаў ЦП прафсаюзаў і ФЗМК.

7. НАРБ. – Ф. 265. – Воп. 1. – Спр. 2583. Материалы о состоянии работы по белорусизации в ЦП профсоюзов и фабзавкомах, 1928–1929 гг.

8. НАРБ. – Ф. 265. – Воп. 1. – Спр. 2585. Материалы по организации культмассовой работы среди членов профсоюзов и работе профсоюзных клубов, 1928–1929 гг.

9. НАРБ. – Ф. 265. – Воп. 1. – Спр. 4026, арк. 185–187. Сведения о работе профсоюзов Беларуси.

10. НАРБ. – Ф. 265. – Воп. 1. – Спр. 2944. Сведения ЦСПСБ о проведении белорусизации и обслуживании нацменьшинств профсоюзами БССР, 1930–1931 гг.

11. Матэрыялы да справаздачы Цэнтральнага савету прафсаюзаў БССР 7-му Усебеларускаму з’езду прафсаюзаў. – Мінск, 1932. – 183 с.

12. НАРБ. – Ф. 265. – Воп. 1. – Спр. 2437. Пратаколы пасяджэнняў Прэзідыума ЦСПСБ, 1929 г.

## Этнічныя стэрэатыпы жыхароў Беларусі па матэрыялах вуснай гісторыі

Кедрык Т. В. г. Мінск, БНТУ

Этнічная ідэнтычнасць жыхароў Беларусі з’яўляецца міждысцыплінарным прадметам даследавання, яе вывучэннем займаецца этнаграфія, антрапалогія, этнапсіхалогія, сацыялогія, гісторыя. Пад ідэнтычнасцю варта разумець працэс атаясамлення індывіда ўнутры сацыяльнай групы, дзе ў працэсе ўзаемадзеяння “Я-вобраз” замяшчаецца на калектыўны “Мы-вобраз”. Для асэнсавання ўласнай ідэнтычнасці і ўзнаўлення ідэнтычнасці групавой, чалавеку неабходна наяўнасць стэрэатыпаў у адносінах да іншых груп. Фарміраванне стэрэатыпнага “Яны”-вобраза дапамагае больш выразнаму ўсведамленню “Мы”-вобраза. “Я”, “Мы” і “Яны” утвараюць сабой сістэму элементаў, дзе кожная пазіцыя звязана з іншымі адносінамі тоеснасці і адрознення.

Праблема нацыянальнай ідэнтычнасці варта разглядаць у сувязі з праблемай нацыянальнага стэрэатыпу. Як і ўсякі стэрэатып, ён з’яўляецца своеасаблівым сацыяльным канструктам, спрыяе арыентацыі індывіда ў жыцці, выступае крыніцай матывацыі